Наталля МАТЫЛІЦКАЯ
(г. Мінск)

# ВОПЫТ МУЗЕЙНАЙ РЭКРЭАЦЫІ НА АСНОВЕ ТРАДЫЦЫЙНЫХ КАЛЯНДАРНЫХ СВЯТ 1998 – 2001 ГГ.

Канец 1970-х – пачатак 1980-х гадоў на Беларусі з'яўляўся перыядам абуджэння цікавасці грамадскасці да сваёй гістарычнай спадчыны. У прыватнасці, да вывучэння фальклорна- этнаграфічнага матэрыялу з імкненнем узнавіць і ўкараніць яго на сучаснай глебе. Гэта вылілася ў плённую працу не толькі прафесійных калектываў, але і, што больш важна, некаторых аматарскіх суполак – такіх як "Майстроўня", "Талака", якія паказалі на сваім прыкладзе жывое аднаўленне традыцый.

Гэты ўздым быў настолькі арганічным, што яго не маглі не падтрымаць дзяржаўныя ўстановы культуры. Нас цікавяць, у прыватнасці, музеі. У авангардзе аказаўся Гісторыка-культурны запаведнік "Заслаўе", у якім, пачынаючы з 1981 года і па сённяшні дзень, ладзяцца традыцыйныя абрадавыя святы. Пачалося гэта дзякуючы высілкам шматлікіх людзей, якіх змагла арганізаваць мастацтвазнаўца Т.Гаранская. У творчы калектыў уваходзілі многія вядомыя фалькларысты: Л.Салавей, Г.Таўлай, Г.Барташэвіч, кіраўнікі фальклорных калектываў і г.д.

Першыя традыцыйныя святы ў Заслаўі праводзіліся на высокім узроўні – гэта і здымкі навукова-дакументальнага фільма да юбілею Я.Купалы і Я.Коласа (рэжысёр І.Калоўскі атрымаў за фільм Дзяржпрэмію Беларусі), і запрашэнні славутых аўтэнтычных фальклорных гуртоў, напрыклад, гурта з вёскі Барталамееўка Гомельскай вобласці, які паказаў унікальны рэгіянальны абрад "Ваджэнне стралы".

Наватарскай ідэяй былі рэканструкцыя і ўзнаўленне пяці розных абрадаў Купалля, рэгіянальнай гульні-ігрышча Паазер'я "Жаніцьба Цярэшкі". Гэтыя гады далі свой плён – абудзілі мясцовую моладзь. Так утварыўся спеўны гурт "Заслаўскія летуценнікі", якія ўзялі на сябе арганізацыю і правядзенне абрадавых святаў. Зарадзілася ідэя вывучэння мясцовых фальклорных традыцый: у маі 1987г. была наладжана адмысловая экспедыцыя.

Новы калектыў музея мэтанакіравана стаў укараняць ідэю экамузея, як "школы, што ўцягвае мясцовых жыхароў у сваю дзейнасць па вывучэнні і ахове спадчыны". Гэта выявілася ў праграмах музейнай педагогікі для заслаўскіх школьнікаў. Дзейнасць музея рэкламавалася праз мясцовае радыё. Аўтар артыкула была рэдактарам і вядучай шматлікіх выпускаў перадачы "Тутэйшыя", мэта якой была – псіхалагічна падрыхтаваць заслаўчан, якія прыйдуць на музейныя святы. Фальклорны матэрыял, які выкарыстоўваўся падчас падрыхтоўкі святаў, быў рознарэгіянальным. І ў 1992 годзе прыйшлі да высновы: "Каб народная традыцыя прыжылася, трэба найперш звяртацца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да мясцовых традыцый, а не да традыцый іншых рэгіёнаў". Аўтарам гэтага артыкула вывучаны фальклор Заслаўшчыны па зборніках народнай творчасці. У 1993-1994гг. па Заслаўі і ваколіцах быў праведезны экспедыцыйны збор матэрыялу, які выявіў найперш жыццяздольнасці валачобнага абраду (абыход двароў на Вялікдзень). Узнавіць гэты абрад аўтару ўдалося ў 2000 годзе ў музеі-скансэне (БДМНАіП). Свята адбылося ў в.Азярцо Мінскага р-на, што побач з музеем. У аснову рэпертуара леглі песні паўночна-заходняй часткі Цэнтральнага рэгіёна. Аўтару ўдалося запісаць у летапіснай в.Строчыца цікавы ўзор валачобнай песні для гаспадара: "Як на першы дзень, на святы Вялікдзень...". Пры выкананні песня падхоплівалася мясцовымі бабулямі.

Святы ў музеі-скансэне пачалі праводзіцца з 1996 г., з прыходам туды на працу В.Якімовіч, якая яшчэ ў суполішчы «Талака» арганізоўвала традыцыйныя святы для мінскай моладзі. За тры гады працы калектывам музея было праведзена шмат святаў – Каляды, Гуканне вясны, Юр'е, Купалле, Дажынкі, на якія запрашаліся аўтэнтычныя выканаўцы песень – М.Басякоў, унук сібірскіх перасяленцаў, родам з Чавускага р-на, І.Агееў з Гомельшчыны і спевакі, якія прадстаўляюць другасныя формы фальклору – Т.Пладунова. А.Галіч, І.Яцэвіч, В.Міцкевіч і інш. Выконваліся песні з розных рэгіёнаў Беларусі.

У 1999 г. аўтар гэтых радкоў прыйшла працаваць у музей з ідэяй увасобіць нейкі рэгіянальны абрад. Тым больш, што канцэпцыя музея, заснаваная на адлюстраванні ўсіх рэгіёнаў Беларусі, адпавядала гэтай задуме. Так быў увасоблены абрад Юр'е, паводле відэа- і аўдыёзапісаў, зробленых у в. Пагост Жыткавіцкага р-на, дзе гэты адметны абрад захаваўся як «тураўскі карагод». Вялікая работа была праведзена па ўзнаўленню паслядоўнасці абраду, вырабу атрыбутыкі і асабліва па дакладным узнаўленні дыялектных асаблівасцяў песенных тэкстаў.

Дзякуючы кансультацыям вядомай радыёжурналісткі Р.Гамзовіч, якая і прадставіла нам запісы гэтага абраду ў выкананні фальклорнага гурта студэнтаў Тэатральна-мастацкай акадэміі пад кіраўніцтвам І. Мазюк, што ўдзельнічалі ў пастаноўцы свята, задума ўдалася. У 2000 г. музейнае свята Юр'е было двойчы паказана па БТ у праграме «Панарама», а фрагмент свята ўвайшоў у дакументальны фільм пра вядомы этнакалектыў «Крыві». Іншыя абрадавыя святы музея таксама асвятляліся СМІ (газеты «Культура», «Путешественник», інтэрнэт-газета «Open. by», тэлеперадачы «Беларускі дом», «Сталіца»).

За гэты перыяд удалося рэалізаваць эксклюзіўныя задумы, напрыклад, узнаўленне паводле апісанняў у фальклорных зборніках калляднай гульні «Ката лячы», якая ў XIX ст. шырока бытавала на Случчыне і Міншчыне. Цікавым атрымалася свята «Засцянковыя вячоркі», прымеркаванае да Масленіцы, якое прайшло ў будынку-помніку драўлянай архітэтуры г. Мінска на пачатку XX ст. у Паўночным завулку, 22 .

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Безумоўна, рэкрэацыйнай функцыяй (функцыя адпачынку) каляндарна-абрадавыя святы ў музеі не вычэрпваюцца. Тут мае месца яшчэ і асветніцкая, і рэкламная функцыі святаў. Арганізацыя і правядзенне такіх мерапрыемстваў у музеі-скансэне сутыкалася з шэрагам праблемаў, што, у рэшце рэшт, і прывяло да спынення дзейнасці.

Для таго, каб у будучыні святы аднавіліся, патрэбна выкананне наступных умоў:

- стварэнне фальклорна-этнаграфічнага тэатра, які б складаўся пераважна з супрацоўнікаў музея – фалькларыстаў, этнамузыколагаў, народных спевакоў і музыкаў (гэта запатрабуе перагляду цяперашняй штатнай структуры);
- частковая камерцыялізацыя рэкрэацыйна-святочных мерапрыемстваў.

Гэты шлях прайшлі ўжо многія замежныя музеі. Са слоў дырэктара архітэктурна-этнаграфічнага музея «Тальцы» (г. Іркуцк, Расія) В.Ціханава, іх святы праводзяцца з дапамогай нанятых прафесійных фальклорных калектываў.

Нам падаецца больш плённым шлях музея «Кіжы», які мае створаны пры ўдзеле музейных супрацоўнікаў фальклорна-этнаграфічны тэатр. Касцюмы ўдзельнікаў з'яўляюцца дакладнымі копіямі рускіх касцюмаў Заанежжа і Памор'я. Акрамя таго, тэатр атрымлівае заказы на ўзнаўленне абрадаў пэўнага рэгіёна.

Прафесійныя музеі, у прыватнасці, музей-скансэн, павінны надалей стварыць канкурэнцыю камерцыйнаму музею ў Дудутках, праз карэкцыю сваіх мерапрыемстваў у бок відовішчнасці.

## Літаратура


1. Гаранская, Т. Адраджэнне і рэканструкцыя традыцыйных абрадаў на базе Музея рамёстваў і народных промыслаў Беларусі ў Заслаўі / Т.Гаранская // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Заслаўя. – Мінск, 2000. – С. 402 – 410.
2. Матыліцкая, Н. Фальклорныя традыцыі Заслаўшчыны / Н.Матыліцкая // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Заслаўя. – Мінск, 2000. – С.415.
3. Матыліцкая, Н. Заслаўскія фальклорныя традыцыі : гісторыя і сучаснасць / Н.Матыліцкая // Наша жыццё. – 1995. – 2 верасня.
4. Мухін, В. Купалле з Сямёнам Домашам / В.Мухін // Радыё Рацыя. – 2001. – 7 ліпеня.
5. Рагоўская, А. Дзень, калі сонца купаецца / А.Рагоўская // Культура. – 2001. – 21 – 27 ліпеня.
6. Саратов, С. Жизнь продолжается / С.Саратов // Беларус-INTERNET-газ. «Open. by». – 2001. –12 снежня.
7. Семененко, Т. Экомузеи Франции : новые тенденции в развитии музейной идеологии / Т.Семененко // Музейное дело. Музей, культура, общество : сб. науч. тр. – М., 1992. – Вып. 21. – С. 214.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ